ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ГІСТОРЫЯ*

***HISTORY***

УДК 930(476)(1921–1939)
https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-3-286-297

Паступіў у рэдакцыю 07.04.2020
Received 07.04.2020

**А. С. Горны**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь*

# ЭГА-ДАКУМЕНТЫ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ Ў МІЖВАЕННАЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

**Аннотация.** Представлены основные теоретические подходы, существующие в отечественной и зарубежной историографии по проблеме эго-документов как исторических источников. Анализируется роль голландского историка Жака Прессера в создании этого термина и его распространении в зарубежной исторической науке в 1980–1990 гг. Автор статьи, принимая во внимание европейский опыт, дает собственное определение термина «эго-документы», адаптированное к белорусской историографии, и подчеркивает научную целесообразность активного использования эго-документов при изучении истории белорусского национального движения в межвоенной Западной Беларуси.

Раскрывается научная ценность эго-документов как источников для изучения различных тем, связанных с историей белорусского национального движения в межвоенной Западной Беларуси. На примере писем в белорусский книжный магазин в Вильно анализируется научный потенциал деловой переписки как части эпистолярных источников. Выделяется пять видов мемуарной литературы, которые расширяют наши знания о различных вехах жизни и деятельности активистов белорусского движения в межвоенной Западной Беларуси. Анализ университетских автобиографий и curriculum vitae подчеркивает недостаточное количество исследований по этому типу эго-документов и его научную ценность при изучении взаимоотношений между белорусскими активистами и польским государством. Среди автобиографического жанра есть два малоисследованных типа документов: автобиографические анкеты и следственные автобиографии, которым исследователи уделяют мало внимания в научной практике.

Делаются выводы о незначительном использовании эго-документов при изучении истории белорусского движения в межвоенной Западной Беларуси. Антропологический поворот в историографии определил стремление современных историков обратить внимание на проблему повседневной жизни белорусского движения, его локальные измерения, что предопределяет активное использование эго-документов в качестве исторических источников.

**Ключевые слова**: эго-документы, белорусское национальное движение, Западная Беларусь, межвоенная Польша, мемуары, автобиография, дневники

**Для цитирования:** Горны, А. С. Эга-дакументы як крыніцы па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі / А. С. Горны // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2020. – Т. 65, № 3. – С. 286–297. https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-3-286-297

**Aliaksandr S. Gorny**

*Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno, Belarus*

# EGO-DOCUMENTS AS SOURCES FOR THE HISTORY OF BELARUSIAN NATIONAL MOVEMENT IN INTERWAR WESTERN BELARUS

**Abstract.** The main theoretical approaches that exist in domestic and foreign historiography on the problem of ego-documents are given in the introduction. Role of the Dutch historian Jacques Presser in creation of this term and its use in foreign historical science in the 1980–1990s is analyzed. The author of the article, taking into account European experience, is trying to give his own definition of the term “ego-documents”, adapted to Belarusian historiography. The author also notes the scientific feasibility of the active use of ego-documents when studying the history of the Belarusian national movement in the interwar Western Belarus.

© Горны А. С., 2020

The main part of the article reveals the scientific value of ego-documents as sources for studying various topics related to the history of the Belarusian national movement in the interwar Western Belarus. As an example, the author took letters to the Vilnius Belarusian bookstore, and analyzed the scientific potential of business correspondence as part of epistolary sources. Five types of memoir literature, which help to expand knowledge about various figures of the Belarusian movement in the interwar Western Belarus, were formed. An analysis of university autobiography and curriculum vitae emphasizes the lack of knowledge of this type of ego-documents and its scientific value in the study of relations between Belarusian activists and the Polish state.

In conclusion, conclusions are drawn about the insignificant use of ego-documents in the study of the history of Belarusian nationalism in the interwar Western Belarus. The anthropological turn in historiography has determined the desire of modern historians to pay attention to the everyday problem of the Belarusian movement, its local features that determines the active use of ego-documents as sources.

**Keywords**: ego-documents, the Belarusian national movement, Western Belarus, interwar Poland, memoirs, autobiography, diaries

**For citation:** Gorny A. S. Ego-documents as sources for the history of Belarusian national movement in interwar western Belarus. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2020, vol. 65, no. 3, pp. 286–297 (in Belarusian). https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-3-286-297

**Уводзіны**. Антрапалагічны паварот у гістарыяграфіі ў другой палове XX ст. прымусіў многіх гісторыкаў звярнуць увагу на новую крыніцавую базу, якая дазваляла больш грунтоўна прасачыць паўсядзённыя практыкі звычайных людзей у гістарычнай рэтраспектыве. Зніжэнне аўтарытэту афіцыйных справаводчых дакументаў і пашырэнне міждысцыплінарнасці ў даследаваннях прывялі да актыўнага выкарыстання тых крыніц, якія адлюстроўвалі не столькі знешнія гістарычныя працэсы, колькі ўнутраны свет чалавека, яго эмоцыі, праявы ідэнтычнасці і калектыўнасці. У першую чаргу такімі дакументамі былі аўтабіяграфіі, мемуары, дзённікі, лісты і інш. Па вызначэнні сучасных крыніцазнаўцаў, гэтыя дакументы не толькі асвятлялі гістарычную падзею, але і стваралі яе адчуванне, падкрэсліваючы эмацыянальны кампанент [1, с. 6].

З 1980-х гг. у савецкай гістарыяграфіі за дакументамі падобнага роду замацаваўся тэрмін "дакументы асабістага паходжання". У той жа час гэтыя дакументы як у рамках савецкай, так і постсавецкай гістарыяграфіі ў шматлікіх даследаваннях займалі другаснае месца, з'яўляючыся як бы дадаткам да шырокага кола дакументальных крыніц [1, с. 9]. Такі падыход быў абумоўлены панаваннем пазітывісцкай альбо марксісцкай традыцыі ў даследаваннях, а таксама адносінамі даследчыкаў да асабістых дакументаў як да выключна суб'ектыўных крыніц. У беларускай гістарыяграфіі шмат у чым захавалася падобная ацэнка на тэарэтычным узроўні. Напрыклад, ва ўніверсітэцкім падручніку "Тэорыя і гісторыя крыніцазнаўства", які з'яўляецца на сённяшні час класічным падручнікам па вывучэнні беларускага крыніцазнаўства, эпісталярныя крыніцы, мемуары, дзённікі адносяцца да апавядальнага тыпу крыніц. У выданні падкрэсліваецца, што гэтыя крыніцы "ствараліся спецыяльна для перадачы інфармацыі, якая падвяргалася, безумоўна, больш істотнаму скажэнню" [2, с. 24].

У той жа час у еўрапейскай гістарыяграфіі існуе іншая традыцыя даследавання і аналізу крыніц асабістага паходжання, якую мэтазгодна выкарыстоўваць і ўкараняць у айчыннай навуцы. У 1958 г. галандскі гісторык Жак Прэсер (Jacques Presser), які спецыялізаваўся на пошуку дзённікаў і іншых дакументаў ахвяр Халакоста ў Нідэрландах, выпрацаваў агульны тэрмін для азначэння аўтабіяграфій, мемуараў, дзённікаў, прыватных лістоў – "эга-дакументы". Першапачаткова ён ахарактарызаваў гэтае паняцце наступным чынам: "Эга-дакументы – гэта тыя гістарычныя крыніцы, у якіх даследчык сутыкаецца з "я", якое пастаянна прысутнічае ў тэксце ў якасці прадмета, што піша і апісвае" [3, p. 14]. Праз некалькі год Прэсер прапанаваў больш лаканічнае азначэнне гэтага паняцця: "Эга-дакументы – гэта тыя крыніцы, дзе эга наўмысна ці выпадкова раскрывае або ўтойвае сябе" [4, p. 278]. Пры гэтым першапачаткова ў межах гэтага паняцця разглядаліся толькі дзённікі, мемуары, аўтабіяграфіі і ўласная перапіска.

Аднак амаль праз 50 гадоў неалагізм Прэсера выйшаў за рамкі галандскай гістарычнай навукі і пашырыўся ў еўрапейскім навуковым дыскурсе. У 1996 г. англійскі гісторык Пітэр Берк адным з першых адаптаваў гэты тэрмін для англамоўнай гістарыяграфіі [3, p. 14]. Адначасова з Беркам нямецкі гісторык Вінфрэд Шульц пачаў выкарыстоўваць гэтае паняцце ў нямецкай гістарыяграфіі і нават значна пашырыў яго змест. Паводле Шульца, эга-дакумент – "гэта ка-

тэгорыя, якая ахоплівае ўсе тыя крыніцы, у якіх чалавек распавядае нам штосьці аб сабе, робячы гэта па свабоднай волі ці ў іншых умовах". Гэта апошняе ўдакладненне – "у іншых умовах" – дазволіла Шульцу значна пашырыць арэал эга-дакументаў і ўключыць у іх пералік, напрыклад, пратаколы судовых пасяджэнняў, пратаколы допытаў, хадайніцтва аб памілаванні, тэстаменты і перадсмяротныя запіскі, curriculum vitae і інш. [4, p. 279]. Такім чынам, на сённяшні час азначэнне, прапанаванае Шульцам, з'яўляецца найбольш прымальным і ахоплівае максімальную колькасць відаў крыніц, якія могуць быць аднесены да эга-дакументаў. У адпаведнасці з гэтым у дадзеным артыкуле пад эга-дакументамі мы будзем разумець усе тыя гістарычныя крыніцы, дзе чалавек свядома ці несвядома перадае свой унутраны свет, пачуцці, перажыванні, меркаванні, знаходзячыся ў розных абставінах ці ўмовах.

У беларускай гістарыяграфіі на сучасным этапе эга-дакументы паступова пачынаюць губляць сваё другаснае палажэнне і займаць адну з галоўных пазіцый у крыніцавай базе даследаванняў, пабудаваных на новых метадалагічных падыходах. Аднак праблематыку гісторыі беларускага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі гэтыя змяненні закранулі ў меншай ступені. Сярод большасці даследчыкаў, якія спецыялізуюцца па гэтай тэматыцы, "папулярнымі" крыніцамі па-ранейшаму выступаюць справаводчыя дакументы (справаздачы польскай паліцыі, польскіх органаў улады, унутраная дакументацыя беларускіх арганізацый і інш.) і матэрыялы перыядычнага друку. Тым не менш у рамках вывучэння дадзенай праблемы наспела неабходнасць пашырэння даследчыцкага поля шляхам вызначэння паўсядзённых структур беларускага руху, яго прасапаграфіі, лакальных асаблівасцей, сацыяльных ліфтоў і інш. Гэтая акалічнасць павінна штурхаць даследчыкаў выяўляць новыя крыніцы, звязаныя з аналізам унутранага свету чалавека і матываў яго паводзін, а таксама навукова верыфікаваць ужо існуючыя эга-дакументы па гісторыі беларускага нацыянальнага руху.

**Асноўная частка.** Адным з самых вялікіх па аб'ёму корпусам эга-дакументаў па гісторыі беларускага руху ў Заходняй Беларусі з'яўляюцца эпісталярныя крыніцы. Можна вылучыць два віды лістоў, характэрных для гэтага перыяду: 1) дзелавыя лісты, якія адлюстроўвалі афіцыйны характар зносін; 2) прыватныя лісты, для якіх характэрны асабісты ўзровень камунікацыі. Дзелавая перапіска вельмі шырока прадстаўлена ў розных архіўных фондах беларускіх арганізацый міжваеннага перыяду, напрыклад, ф. 361 Таварыства беларускай школы ці ф. 365 Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы, дзе захоўваецца значная колькасць афіцыйных лістоў да кіраўніцтва гэтых арганізацый ад прадстаўнікоў нізавых структур і правінцыяльных аддзелаў. Маладаследаваным матэрыялам можна лічыць лісты ў рэдакцыі беларускіх міжваенных перыядычных выданняў і беларускія кнігарні. Напрыклад, у лістах беларускіх актывістаў у віленскую кнігарню "Пагоня" можна выявіць узровень пашырэння нацыянальнай самасвядомасці сярод мясцовага насельніцтва розных рэгіёнаў Заходняй Беларусі, сферу зацікаўленасці мясцовага беларускага актыву ва ўмовах узмацнення паланізацыі ў канцы 1930-х гг. [5, арк. 1–156].

Прыватнае ліставанне таксама займае значнае месца сярод эпісталярнай спадчыны ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі. Вялікая колькасць лістоў па гэтай праблематыцы захоўваецца ў архіўных фондах асабістага паходжання Т. Грыба і К. Езавітава ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, у фондзе Беларускага навуковага таварыства (ліставанне А. Луцкевіча) і рэдакцыі часопіса "Крывіч" (ліставанне В. Ластоўскага) у Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы, у фондах беларускіх эмігрантаў, якія перапісваліся з заходнебеларускімі грамадскімі і палітычнымі структурамі, у Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі. Гэтыя дакументы адлюстроўваюць багаты фактагічны матэрыял для даследавання праблем сувязі палітычных і культурных сіл Заходняй Беларусі з беларускімі эмігранцкімі цэнтрамі, развіцця інтэлектуальнай думкі беларусаў у міжваенны перыяд. Парадаксальна, што, нягледзячы на добрую рэпрэзентатыўнасць у архіўных фондах, гэтыя эпісталярныя дакументы на сённяшні час у сваёй большасці не апублікаваны асобным выданнем і нязначна ўведзены ў навуковы ўжытак.

Яшчэ адным значным комплексам эга-дакументаў па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі з'яўляюцца ўспаміны яго непасрэдных удзельнікаў. Мемуары як гістарычная крыніца маюць шмат суб'ектыўных характарыстык, якія залежаць ад цэнзурных

падыходаў, палітычных, ідэалагічных ці рэлігійных установак аўтараў, што дало падставы многім гісторыкам ігнараваць гэтыя творы. Фактычна да сярэдзіны XX ст. у гістарыяграфіі мемуары лічыліся выключна другараднай крыніцай, даныя якіх выкарыстоўваліся толькі як дапамога ў факталагічных пошуках [6, с. 7]. Пераадоленне гэтага пазітывісцкага погляду прывяло да таго, што цяпер успаміны з'яўляюцца адной з важных крыніц вывучэння эвалюцыі светапогляду іх аўтараў. Самі суб'ектыўныя ацэнкі могуць выступаць даследчыцкім полем, з дапамогай якога можна аналізаваць кантэкст напісання мемуараў, узаемаадносіны аўтараў з пэўнымі асобамі, механізмы ўтойвання/абвяшчэння рознай інфармацыі. Аўтарства мемуараў у гэтым выпадку мае значную ролю, бо цалкам уплывае на змест наратыву. З гэтага пункта гледжання мемуары па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі можна аб'яднаць у 5 груп: 1) успаміны беларускіх дэпутатаў польскага парламента ў міжваенны перыяд; 2) успаміны літаратараў і культурных дзеячаў; 3) успаміны былых выпускнікоў беларускіх гімназій; 4) успаміны дзеячаў КПЗБ і іншых левaрадыкальных структур у Заходняй Беларусі; 5) успаміны пасляваенных эмігрантаў аб дзеячах беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху.

Сярод мемуараў па гісторыі беларускага руху ў Заходняй Беларусі найбольш тэматычна пашыранай з'яўляецца група ўспамінаў былых беларускіх дэпутатаў польскага парламента ў міжваенны перыяд: В. Рагулі, А. Стагановіча, Ю. Сабалеўскага, П. Карузы. Успаміны апошняга дзеяча, запісаныя на магнітафонную стужку ў 1974 г. у выглядзе інтэрв'ю, на сённяшні час з'яўляюцца маладаследаванымі і чакаюць навуковай апрацоўкі [7, с. 17]. Мемуары В. Рагулі, А. Стагановіча і Ю. Сабалеўскага былі напісаны ўжо ва ўмовах пасляваеннай эміграцыі і змяшчалі шмат суб'ектыўных ацэнак розных падзей і асоб, якія былі пазбаўлены цэнзурных рамак, аднак мелі пэўнае адценне палітычных густаў аўтараў. Хрэстаматыйнымі з гэтага пункта гледжання з'яўляюцца "Успаміны" В. Рагулі, надрукаваныя ў Нью-Ёрку ў 1957 г. і перавыдадзеныя ў Беларусі ў 1993 г. [8]. На сённяшні час гэты твор з'яўляецца адным з самых цытуемых эга-дакументаў у навуковых працах па гісторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. У ім Рагуля узгадаў аб беларускай агітацыі падчас выбараў у польскі сейм у 1922 і 1928 гг., адлюстраваў механізмы працы беларускіх паслоў у парламенце, раскрыў супярэчлівыя аспекты ўтварэння Беларускай сялянска-работніцкай грамады. У кнізе прысутнічаюць асабістыя характарыстыкі многіх беларускіх дзеячаў, у якіх змяшчаліся, часам, дастаткова адкрытыя сведчанні, напрыклад, аб злоўжыванні алкаголем і інш. [8, с. 22–24]. Даследчыцкай каштоўнасцю гэтых успамінаў можна таксама лічыць звесткі аб фінансаванні розных праектаў беларускага руху ў міжваеннай Польшчы, у тым ліку з боку камуністаў і польскіх улад, што на сённяшні час з'яўляецца маладаследаванай і прывабнай для навуковага дыскурсу тэмай [8, с. 39, 49, 58]. Тым не менш палітычная канкурэнцыя, якая мела месца ў асяроддзі беларускай пасляваеннай эміграцыі, наклала суб'ектыўны адбітак на змест успамінаў В. Рагулі, які, у прыватнасці, вельмі крытычна адносіўся да міжваеннай дзейнасці Я. Станкевіча. Апошні, у сваю чаргу, апублікаваў на гэты твор вельмі негатыўную рэцэнзію ў беларускім эміграцыйным друку.

Падобныя супярэчнасці ў асяроддзі беларускай пасляваеннай эміграцыі паўплывалі і на ўспаміны былога беларускага дэпутата пасольскага клуба "Змаганне" А. Стагановіча [9]. Ён катэгарычна адмоўна ахарактарызаваў дзейнасць на заходнебеларускай палітычнай арэне Я. Станкевіча і Р. Астроўскага, спрабаваў крытычна прааналізаваць арганізацыйную працу беларускіх пракамуністычных дзеячаў з клуба "Змаганне" падчас перадвыбарчай кампаніі і парламенцкай барацьбы. Ва ўспамінах Стагановіч пазітыўна ацэньваў ролю БСРГ у беларускім нацыянальным руху, лічыў яе нацыянальна арыентаванай партыяй, а прычыну ліквідацыі "Грамады" бачыў у "камуністычнай правакацыі" [9, с. 251]. У той жа час яго мемуары змяшчаюць шмат перабольшванняў і гістарычных разыходжанняў, напрыклад, пашырэнне ўплываў БСРГ на Навагрудчыне ён звязваў з мітынгамі, арганізаванымі яго блізкім сябрам В. Рагуляй, што насамрэч не адпавядала рэчаіснасці [9, с. 250].

Успаміны Ю. Сабалеўскага, аб'яднаныя пад агульнай назвай "Беларуская сялянска-работніцкая грамада", адлюстроўваюць перыяд ліквідацыі гэтай палітычнай арганізацыі ў 1927 г. і яе пазнейшыя наступствы. Сабалеўскі ва ўспамінах надаў вялікую ўвагу не столькі ўласна "Грамадзе", колькі асабістым перажыванням і жыццёвым акалічнасцям, звязаным з яго праследаван-

нем у сувязі з арыштам лідараў БСРГ у студзені 1927 г. Шмат увагі аўтар звярнуў на апісанне польскай палітыкі адносна беларускага насельніцтва ў Заходняй Беларусі, дзейнасці Б. Тарашкевіча ў якасці лідара БСРГ. Каштоўнасцю гэтых мемуараў можна лічыць таксама характарыстыку ўплыву камуністаў на легальныя формы дзейнасці беларускага руху, у тым ліку ўплыву на гэты рух польскага леварадыкальнага дзеяча С. Ваявудскага і інш. [10].

Асаблівае месца ў мемуарыстыцы па гісторыі беларускага руху ў Заходняй Беларусі складаюць успаміны пісьменнікаў і культурных дзеячаў. Вядомымі ў гэтым плане з'яўляюцца ўспаміны беларускага драматурга Ф. Аляхновіча "У капцюрох ГПУ", выдадзеныя ў 1937 г. пасля вызвалення аўтара з Салавецкага лагера. У першай частцы ўспамінаў Аляхновіч даў невялікі агляд розным перэпетыям беларускага палітычнага жыцця ў Вільні ў 1920-я гг. У прыватнасці, з'яўляючыся віцэ-старшынёй паланафільскай Часовай беларускай рады, у сваіх мемуарах ён ускосна згадаў пра гэтую арганізацыю і апісаў умовы яе функцыянавання і ўнутранага жыцця [11, с. 31, 33–34].

Каштоўнымі і насычанымі на розныя асабістыя характарыстыкі з'яўляюцца ўспаміны беларускага журналіста і друкара Янкі Багдановіча. Яго мемуарныя запісы аб розных перыядах жыцця былі аб'яднаны пад адной вокладкай і выдадзены ў 1992 г. пад назвай "На жыццёвым шляху" ўжо пасля смерці аўтара. Паказальна, што самі ўспаміны былі напісаны ў 1970-я гг. ва ўмовах савецкай рэчаіснасці, якая, пэўным чынам, паўплывала на змест успамінаў. Іх галоўнай каштоўнасцю можна лічыць характарыстыкі, дадзеныя многім вядомым дзеячам беларускага руху, у першую чаргу выкладчыкам Віленскай беларускай гімназіі, з якімі сутыкаўся падчас сваёй вучобы аўтар. Дзякуючы гэтым успамінам можна прааналізаваць асаблівасці характару, унутранага свету, сямейных стасункаў, паводзін у нестандартных абставінах такіх асоб, як Г. Каверда, А. Сакалова-Лекант, Р. Шырма, М. Красінскі, А. Міхалевіч, І. Катовіч, А. Данілевіч і інш. [12]. Асобным раздзелам у кнізе Багдановіча пададзены ўспаміны аб унутранным жыцці Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны ў Вільні ў 1930-я гг., а таксама аб дзейнасці розных віленскіх беларускіх друкароў. Тым не менш, як заўважыў рэдактар А. Ліс у сваёй прадмове, успаміны Янкі Багдановіча мелі "беглы, паспешлівы характар", а некаторыя эпізоды былі адлюстраваны "на ўзроўні бытавой свядомасці" [12, с. 5]. Апошняя ацэнка, аднак, мае адбітак тагачаснага ўзроўню гістарычнага дыскурсу ў беларускай навуцы, бо на сучасным этапе "бытавая" інфармацыя, аналіз жыццёвых дробязяў дапамагаюць гісторыкам раскрыць усю шматграннасць характару і паводзін той ці іншай асобы.

Неабходна адзначыць, што Віленская беларуская гімназія сярод усіх структур беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі "заслужыла" ў гістарычным наратыве найбольшую колькасць успамінаў і мемурараў яе былых вучняў. Невялікія згадкі аб першых гадах існавання гэтай навучальнай установы, аб уроках беларускай літаратуры М. Гарэцкага змяшчаюцца ў "Аўтабіяграфічным нарысе" Н. Арсенневай, які быў напісаны ва ўмовах жыцця аўтара на эміграцыі [13, с. 469–470]. Увогуле, прадстаўнікі пасляваеннай беларускай эміграцыі, вучнёўскае юнацтва большасці з якіх было звязана з беларускімі навучальнымі ўстановамі ў міжваеннай Заходняй Беларусі, дастаткова добра захавалі памяць аб Віленскай беларускай гімназіі, доказам чаго з'яўляюцца, напрыклад, змястоўныя мемуары В. Тумаша, Л. Галяка і інш. [14; 15]. У гэтых успамінах падрабязна адлюстраваны паўсядзённасць гімназічнай моладзі, уплывы палітычнага жыцця на гімназію, дадзены пэўныя характарыстыкі і ацэнкі дзейнасці педагагічнага персаналу. Такі корпус успамінаў аб Віленскай беларускай гімназіі можа стаць грунтоўным дапаможнікам пры даследаванні прасапаграфіі настаўнікаў і вучняў беларускіх гімназій міжваеннага перыяду.

Асобную групу мемуараў па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі складаюць успаміны дзеячаў КПЗБ і іншых пракамуністычных арганізацый. У другой палове 1950-х гг. у беларускай гістарычнай навуцы адбыўся гістарыяграфічны паварот у вывучэнні Заходняй Беларусі, які быў выкліканы рэабілітацыяй КПЗБ падчас ХХ з'езда КПСС [16, с. 45]. Гэта спрыяла разгортванню шырокіх даследаванняў праблем палітычнай гісторыі заходнебеларускіх зямель у міжваенны перыяд. Адной з праяў папулярызацыі дыскурсу заходнебеларускай "рэвалюцыйнай барацьбы" стала падрыхтоўка ўспамінаў былых удзельнікаў леварадыкальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. У прыватнасці, у 1950–1960-я гг. у БССР і Літоўскай ССР

выйшлі зборнікі ўспамінаў былых членаў КПЗБ “У суровыя гады падполля” і “Вильнюсское подполье”, а таксама зборнік успамінаў былых вязняў Бяроза-картузскага лагера “Они не встали на колени”, якія былі падрыхтаваны пры актыўным удзеле тагачасных партыйных структур, у першую чаргу, Інстытутаў гісторыі партыі адпаведных савецкіх рэспублік [17, с. 6]. У 1978 г. выйшаў зборнік дакументаў аб гісторыі камсамола Заходняй Беларусі, дзе былі перадрукаваны шэсць успамінаў былых актывістаў з апублікаваных і вышэйзгаданых зборнікаў [18, с. 17–22, 24–25]. Гэты факт пацвярджае тое, што шмат у чым успаміны былых сяброў КПЗБ разглядаліся не столькі як гістарычная крыніца, колькі як значны выхаваўчы элемент, на аснове якога маладое пакаленне павінна было засвойваць узор прыкладнай “рэвалюцыйнай барацьбы” і змагання за свае ідэалы.

Найбольш выверaным з ідэалагічнага пункта гледжання і навукова вартым можна лічыць зборнік успамінаў левaрадыкальных актывістаў Заходняй Беларусі “Годы испытаний и мужества”, выдадзены ў 1973 г. пад рэдакцыяй былога сябра КПЗБ М. Арэхвы і М. Сташкевіча. У зборніку былі надрукаваны ўспаміны не толькі шэраговых актывістаў камуністычных арганізацый, але і вядомых функцыянераў беларускага леварадыкальнага руху, напрыклад, П. Пестрака, М. Танка, С. Прытыцкага, С. Малько, Ф. Цігельніцкай, П. Крынчыка і інш. Задача гэтых успамінаў – падкрэсліць рэвалюцыйную гераіку заходнебеларускай рэчаіснасці і паказаць тыповы прыклад “рэвалюцыйнага барацьбіта”, які можа ахвяраваць свае здольнасці дзеля партыйных патрэб. Безумоўна, успаміны былі падрабязна адрэдагаваны савецкімі гісторыкамі ў плане агучвання розных палітычных імёнаў і ацэнкі дзейнасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый, якія ў савецкай гістарыяграфіі лічыліся “буржуазнымі”. Тым не менш некаторым аўтарам, як, напрыклад, С. Малько, дазвалялася асцярожна выйсці за рамкі ўсталяванага канона і зрабіць даволі падрабязную ацэнку кантактаў заходнебеларускіх камуністаў з нацыянальна-дэмакратычнымі дзеячамі ў канцы 1930-х гг. [17, с. 358–359].

Падобная акалічнасць была характэрна таксама для асобных успамінаў аднаго з членаў ЦК КПЗБ М. Арэхвы, выдадзеных у 1983 г. У сваёй кнізе аўтар дастаткова асцярожна ўзгадваў ролю камуністычных дзеячаў у станаўленні і развіцці структур БСРГ у Заходняй Беларусі, у тым ліку знакамітую “гданьскую канферэнцыю”, характарызаваў акалічнасці барацьбы з т. зв. “сэцэсіяй” у КПЗБ і даваў ацэнкі дзейнасці многім актывістам леварадыкальнага руху. Разам з тым мемуары Арэхвы практычна не выходзілі за рамкі стандартаў мемуарнай літаратуры савецкіх партыйных і дзяржаўных дзеячаў [19]. Прысутнасць у гэтых успамінах двух рэцэнзентаў – навуковых адмыслоўцаў па гісторыі міжваеннага перыяду – пацвярджае факт іх рэдагавання ў адпаведнасці з тагачаснымі ідэалагічнымі патрабаваннямі.

За пэўныя рамкі дадзенай групы мемуараў дзеячаў леварадыкальнага беларускага руху выходзяць успаміны М. Гурына-Маразоўскага, аднаго з лідараў т. зв. “сэцэсіі” КПЗБ, які выйшаў з партыі і пачаў супрацоўнічаць з польскімі ўладамі. Частка яго мемуараў “З недалёкага мінулага” была надрукавана ў 1927 г. у беларускай паланафільскай газеце “Беларускі дзень” і фактычна мела іншую накіраванасць, чым ідэалагічна правільныя пасляваенныя ўспаміны дзеячаў КПЗБ. Гурын спрабаваў паказаць дэструктыўную ролю камуністаў у беларускім руху, даваў уласныя ацэнкі дзейнасці некаторых беларускіх лідараў, напрыклад, А. Луцкевіча і В. Рагулі, якіх лічыў “антыкамуністамі” і вельмі “хітрымі” палітыкамі, што не падпадаюць пад камуністычныя ўплывы. Успаміны Гурына засталіся нясконачанымі, бо ў 1928 г. ён быў забіты ў Вільні актывістам КПЗБ [20].

Пятую групу мемуараў па гісторыі беларускага руху ў Заходняй Беларусі складаюць успаміны некаторых пасляваенных эмігрантаў, сведак заходнебеларускіх падзей, якія былі прысвечаны выдатным асобам. У асноўным гэтыя ўспаміны друкаваліся ў эміграцкіх рэлігійных часопісах (“Зніч”, “Божым шляхам”) і прыгадвалі некаторыя вехі жыцця дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, у тым ліку актывістаў былой БХД. Сярод іх найбольшую цікавасць прадстаўляюць успаміны пра Ф. Ярэміча [21], С. Грынкевіча [22], А. Клімовіча [23] і ксяндза А. Станкевіча [24], у якіх прысутнічаюць пэўныя згадкі пра акалічнасці іх паўсядзённага жыцця, асаблівасці характару, сямейныя стасункі і ўзаемаадносіны з іншымі людзьмі. Малавывучанасць біяграфій некаторых з гэтых асоб у сучаснай гістарыяграфіі дае падставы лічыць гэтыя невялі-

кія па аб’ёму ўспаміны важнымі крыніцамі для рэканструкцыі біяграфічных сюжэтаў згаданых дзеячаў і іх ролі ў паўсядзённасці беларускага руху ў міжваеннай Польшчы.

Малавывучанымі ў айчынным крыніцазнаўстве з’яўляюцца таксама аўтабіяграфіі і curriculum vitae дзеячаў беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі. На сённяшні час у навуковы ўжытак уведзена невялікая частка дакументаў падобнага роду і акрэсленага перыяду. У дадзеным кантэксце маюцца на ўвазе не літаратурныя аўтабіяграфіі, якія вельмі падобныя на мемуарны жанр, а т. зв. справаводчыя аўтабіяграфіі, дастаткова аднастайныя па сваім змесце. З аднаго боку, гэтыя дакументы, дзякуючы афіцыйна-дзелавому стылю, напісаны сухой справаводчай мовай, маюць невялікую інфарматыўнасць і факталогію, аднак пры дэтальным вывучэнні могуць дапамагчы раскрыць многія рысы ўнутранага свету, палітычных перакананняў і нацыянальнай самасвядомасці той ці іншай асобы. Справаводчыя аўтабіяграфіі і curriculum vitae шмат у чым падобныя да літаратурных аўтабіяграфій і успамінаў: у іх таксама прысутнічаюць храналагічна-рэтраспектыўныя апавяданні чалавека аб сваім жыцці, якія змяшчаюць многія аўтабіяграфічныя даныя [25, с. 108].

Беларускі нацыянальны рух у міжваеннай Заходняй Беларусі ў некаторай ступені быў “бедным” на аўтабіяграфічныя дакументы. Многія дзеячы гэтага руху пісалі ўласныя аўтабіяграфіі ці curriculum vitae толькі для пэўных дзяржаўных устаноў міжваеннай Польшчы дзеля дакументацыйнай патрэбы ці па запыту грамадскіх, у першую чаргу, партыйных структур. Безумоўна, аўтабіяграфічны наратыў шмат у чым залежаў ад стаўлення аўтара да адрасату і таму мог утрымліваць ці, наадварот, не ўтрымліваць некаторыя звесткі. Звычайна да такіх дакументаў звяртаюцца біёграфы палітычных і грамадскіх дзеячаў, каб, дзякуючы фактаграфічным сведчанням, рэканструяваць жыццёвы шлях вывучаемай асобы.

З гэтага пункта гледжання звяртае на сябе ўвагу значны комплекс справаводчых аўтабіяграфій ці curriculum vitae беларускіх дзеячаў, які захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы ў фондзе Віленскага ўніверсітэта. У міжваенны перыяд многія беларускія актывісты атрымлівалі вышэйшую адукацыю ў гэтым універсітэце і пры паступленні былі абавязаны напісаць свае кароткія жыццяпісы. Звычайна гэтыя дакументы былі напісаны ў адпаведнасці з наступнай структурай: дата і месца нараджэння, атрыманая адукацыя, месца працы, некаторыя іншыя біяграфічныя звесткі, напрыклад, служба ў розных вайсковых фарміраваннях ці бежанства ў часы Першай сусветнай вайны. Паказальна, што сярод 15 аўтабіяграфій, прааналізаваных аўтарам гэтага артыкула, ніводная не ўтрымлівала звестак аб грамадскай дзейнасці ці ўдзеле ў беларускім нацыянальным руху. Нават такія вядомыя дзеячы, як, напрыклад, Р. Астроўскі, К. Крук ці А. Паўлюкевіч, у сваіх аўтабіяграфіях апускалі звесткі пра палітычную і грамадскую дзейнасць і ўвогуле не згадвалі, што з’яўляюцца актывістамі тых ці іншых беларускіх структур [26, арк. 11; 27, арк. 34; 28, арк. 6–7]. Замоўчванне падобнай інфармацыі дазваляла ім пэўным чынам легалізавацца ў польскім грамадстве і атрымаць магчымасць увайсці ў дзяржаўныя ўстановы, якім з’яўляўся ў тым ліку і Віленскі ўніверсітэт. Як заўважыў рускі гісторык Ю. Зарэцкі, людзі, калі пісалі справаводчыя аўтабіяграфіі, уступалі ў пэўны дыялог з дзяржавай і баяліся, што дзяржава можа “адказаць” ім негатыўным чынам [25, с. 118]. Паказальна, што Астроўскі і Крук падкрэслілі ў сваіх аўтабіяграфіях, што ў часы грамадзянскай вайны ў Расіі служылі ў антыбальшавіцкіх фарміраваннях. Дадзеная інфармацыя была прапісана, хутчэй за ўсё, з разлікам адсунуць абвінавачванні ў бальшавізме, якія вельмі часта выказваліся з боку польскіх дзяржаўных чыноўнікаў у адрас беларусаў.

Нярэдка ўніверсітэцкія аўтабіяграфічныя дадзеныя могуць выступаць пэўным паказчыкам змен нацыянальнай ідэнтычнасці беларускіх актывістаў, якія былі зроблены свядома з мэтай забяспечыць сабе кар’еру ці бесклапотнае жыццё ў рамках польскага грамадства. Так, беларускі дзеяч у Гродне ў 1919–1920 гг., сябра Гродзенскага Беларускага нацыянальнага камітэта Я. Натусевіч ужо ў 1921 г. у сваіх аўтабіяграфічных звестках для Віленскага ўніверсітэта падаваў сваю нацыянальнасць як “паляк”, а родную мову – як польскую [29, арк. 7]. Адзін з лідараў беларускай студэнцкай карпарацыі “Скарынія” К. Глінскі ва ўніверсітэцкім curriculum vitae падкрэсліў польскую нацыянальнасць і пазначыў свой удзел у шэрагу польскіх моладзевых арганізацый [30, арк. 36].

Аўтабіяграфіі, падрыхтаваныя для партыйных ці грамадскіх структур, мелі, безумоўна, іншы змест і факталогію. У гэтых жыццяпісах аўтары, наадварот, імкнуліся падкрэсліць сваю дзейнасць на карысць беларускага руху, адлюстраваць прыклады рэпрэсій з боку польскіх улад і нават вызначыць сваё стаўленне да тых ці іншых канкурэнтаў на беларускай палітычнай арэне. Яскравым прыкладам тут можа выступаць аўтабіяграфія В. Таўлая, напісаная ў 1946 г. У ёй узгадваліся турэмныя зняволенні, якія зазнаў аўтар у міжваенны перыяд у Заходняй Беларусі, а таксама дзейнасць у структурах КПЗБ і рэдкалегіях беларускіх перыядычных выданняў [31, с. 152–154]. Найбольш змястоўнай таксама з’яўляецца аўтабіяграфія Б. Тарашкевіча, падрыхтаваная ў 1933 г. для савецкіх органаў дзяржбяспекі, у якой аўтар вельмі падрабязна адлюстраваў свой удзел у розных структурах беларускага руху, у тым ліку ў Заходняй Беларусі. Дадзеная аўтабіяграфія, апублікаваная ў 1990-я гг., да нядаўняга часу з’яўлялася для гісторыкаў бадай адзіным змястоўным эга-дакументам па гісторыі ўзнікнення і дзейнасці Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў 1926–1927 гг. Тым не менш у ёй прысутнічае шмат суб’ектыўных ацэнак, выкліканых палітычнай кан’юнктурай і лексіконам, якія існавалі ў тагачаснай савецкай рэчаіснасці. Тарашкевіч, які фактычна ў 1910–1920-я гг. з’яўляўся актыўным дзеячам беларускага руху, у 1930-я гг. ужо пад прэсінгам савецкай рэпрэсіўнай палітыкі называў беларускі рух “дробнабуржуазным”, а некаторых яго прадстаўнікоў абвінавачваў у “нацыянал-дэмакратызме” [32].

Вельмі блізкімі да аўтабіяграфічнага жанру з’яўляюцца яшчэ два тыпы эга-дакументаў, маладаследаваных у айчынным гістарычным дыскурсе: аўтабіяграфічныя анкеты і следчыя паказанні з аўтабіяграфічнымі данымі. Першыя дакументы мелі, збольшага, прыкладны характар і запаўняліся чалавекам пры працаўладкаванні ці далучэнні да дзейнасці нейкай грамадскай структуры. Пэўная форма анкет і дакладна вызначаныя пытанні прадвызначылі дастаткова сухі і абмежаваны змест гэтых дакументаў з факталагічнага пункта гледжання. Тым не менш грунтоўнае вывучэнне інфармацыі ў анкетах і параўнанне яе з іншымі біяграфічнымі данымі асобы дасць магчымасць вызначыць унутраныя механізмы запаўнення анкеты, праблему фільтрацыі і адбору той ці іншай інфармацыі з улікам палітычнага і сацыяльнага фактару.

У межах беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі анкетаванне асоб не было распаўсюджанай з’явай. У асноўным анкеты запаўняліся шматлікімі настаўнікамі дзеля працаўладкавання ў беларускіх школах. Яскравым прыкладам у гэтым плане могуць выступаць анкеты беларускіх дзеячаў, запоўненыя па запыту Беларускага цэнтра ў Літве ў 1940 г. Гэтая арганізацыя праз газету “Крыніца” абвясціла пошук настаўнікаў у Вільні, якія маглі б арганізоўваць беларускае школьніцтва ў Літве. На адрас Беларускага цэнтра прыйшла значная колькасць анкет розных беларускіх актывістаў, лёс большасці з якіх быў звязаны з беларускім рухам у Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. У анкетах прапаноўвалася падаць кароткія біяграфічныя звесткі, пазначыць канфесійную прыналежнасць, вопыт педагагічнай працы, сяброўства ў беларускіх арганізацыях. Найбольш цікавым з пункта гледжання даследавання зваротнай сувязі аўтараў анкеты можна лічыць пытанне аб адносінах да справы беларускага школьніцтва, дзе актывіст мог выказаць свае ўласныя думкі і пажаданні наконт акрэсленай праблемы. Сярод дадзеных дакументаў сустракаюцца анкеты такіх дзеячаў, як М. Маскалік, С. Кароль, Я. Шнаркевіч, А. Ружанцоў, М. Дзямідаў, У. Сініла і інш. Цікавасць уяўляюць некаторыя анкеты рускіх ці польскіх настаўнікаў, напрыклад, С. Любіч-Маеўскага ці А. Егера, у якіх можна прасачыць характэрныя жаданні гэтых людзей далучыцца да беларускага нацыянальнага праекта [33, арк. 1–29].

Яшчэ адным тыпам эга-дакументаў, блізкім да аўтабіяграфій, могуць лічыцца следчыя паказанні, у асноўным тая іх частка, дзе чалавек падрабязна характарызуе падзеі свайго жыцця ад нараджэння да сучаснага стану. Пануючыя на сённяшні час у айчынным крыніцазнаўстве падыходы адносяць гэтыя крыніцы да дакументаў справаводства, аднак, відавочна, з улікам новых метадалагічных рэалій, пратаколы допытаў, дзе маюцца аўтабіяграфічныя даныя, мэтазгодна адносіць да эга-дакументаў. Яскрава гэта адлюстравана на прыкладзе вялікага корпуса пратаколаў допытаў дзеячаў беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі, якія могуць лічыцца сапраўднымі аўтабіяграфіямі ці мемуарамі з дастаткова добрай літаратурнай апрацоўкай уласна аўтара. Напрыклад, падрабязна асвятліў асноўныя вехі свайго жыцця і дзейнасці для савецкіх органаў дзяржбяспекі адзін з лідараў беларускага руху ў Заходняй Беларусі

А. Луцкевіч. У сваіх следчых паказаннях ад 30 кастрычніка і 17 лістапада 1939 г. ён, у дачыненні да падзей заходнебеларускай гісторыі, узгадаў пра ўдзел беларусаў у парламенцкіх выбарах міжваеннай Польшчы, кантакты беларускага руху з камуністычнымі функцыянерамі, даў характарыстыкі некаторым беларускім арганізацыям (БСРГ, ТБШ, Цэнтрасаюз) і асобным дзеячам [34, с. 246–262]. Аднак неабходна разумець, што пратаколы допытаў маглі мець суб'ектыўны падтэкст, выконваць функцыю "апраўдання" перад той ці іншай уладай, дзе аўтар замоўчваў ці свядома скажаў факты рэчаіснасці. У прыватнасці, Луцкевіч у паказаннях дастаткова негатыўна выказваўся аб дзейнасці сваіх былых палітычных канкурэнтаў (Ф. Акінчыц, Р. Астроўскі), з якімі ў 1920-я гг. супольна працаваў у розных беларускіх праектах, свядома прыніжаў сваю арганізацыйную і маральную ролю ў развіцці беларускага руху ў Заходняй Беларусі. Напрыклад, ён называў Б. Тарашкевіча і Р. Астроўскага "фактычнымі дыктатарамі" БСРГ, але сам замоўчваў свой падобны дыктатарскі статус у гэтай арганізацыі, бо на канец 1930-х гг. у савецкім палітычным лексіконе "Грамада" ўжо лічылася "нацыяналістычнай" арганізацыяй [34, с. 255].

У адрозненне ад следчай аўтабіяграфіі А. Луцкевіча, якая была передрукавана ў навуковых выданнях, многія следчыя справы іншых беларускіх дзеячаў міжваеннай Заходняй Беларусі на сённяшні час не ўведзены ў навуковы ўжытак ці неапублікаваны. У прыватнасці, значная колькасць падобных спраў з адкрытым доступам захоўваецца ў Асобым архіве Літвы у г. Вільнюс. Сярод іншых тут захоўваюцца пратаколы допытаў А. Станкевіча, Я. Шутовіча, А. Сакаловай-Лекант, С. Грынкевіча, В. Жук-Грышкевіча, А. Клімовіча і інш. У якасці абвінавачаных падчас допытаў яны павінны былі прадаставіць следству свае падрабязныя ці невялікія аўтабіяграфічныя даныя, аб'ём якіх звычайна залежаў ад значнасці таго ці іншага дзеяча ў беларускім палітычным і культурна-асветніцкім жыцці. Напрыклад, следчая аўтабіяграфія ксяндза А. Станкевіча ахоплівала каля 20 старонак тэксту і змяшчала не толькі канкрэтныя звесткі пра жыццё і дзейнасць. У ёй Станкевіч спрабаваў пэўным чынам "выбачыцца" перад савецкай уладай, паказаць, што яго антысавецкая і незалежніцкая пазіцыя ў міжваенны перыяд была праявай "моднага эгаістычнага нацыяналізму" ці наўпрост неразумннем савецкага ладу [35, арк. 156]. У той жа час следчыя аўтабіяграфіі менш уплывовых дзеячаў беларускага руху, напрыклад, А. Сакаловай-Лекант ці В. Жук-Грышкевіча, былі кароткія, малаінфарматыўныя і дастаткова "сухія" на ацэнкі і пазіцыю адносна савецкага ладу. У іх няшмат згадак аб актыўнасці ў рамках беларускага нацыянальнага руху. Напрыклад, А. Сакалова-Лекант адносна беларускага руху пазначыла толькі працу выкладчыкам Віленскай беларускай гімназіі і не ўзгадала аб удзеле ў шэрагу беларускіх культурна-асветніцкіх арганізацыях (ТБШ, Беларускае дабрачыннае таварыства) [36, арк. 13–13 адв.]. Жук-Грышкевіч у сваёй аўтабіяграфіі, наадварот, "апусціў" інфармацыю аб працы выкладчыкам беларусазнаўства ў Віленскай духоўнай семінарыі, аднак узгадаў сваё членства ў ТБШ і БСРГ у 1920-я гг. [37, арк. 21–22].

Найменш рэпрэзентатыўнымі эга-дакументамі па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі можна лічыць дзённікавыя запісы. Нягледзячы на тое, што дзённікі ў міжваенны перыяд з'яўляліся неад'емнай і моднай часткай паўсядзённасці прадстаўнікоў розных пластоў грамадства, на сённяшні час выяўлена няшмат дзённікавых запісаў беларускіх палітыкаў і грамадска-культурных дзеячаў. Напрыклад, калі ў польскіх ці літоўскіх даследаваннях гісторыі міжваеннага перыяду дзённікі палітыкаў і грамадскіх дзеячаў складаюць значную ролю ў фарміраванні крыніцавай базы, то ў беларускім выпадку працэнт наяўнасці дзённікаў сярод крыніц даследаванняў вельмі нізкі. Гэтая акалічнасць стварае пэўныя цяжкасці ў вывучэнні паўсядзённага жыцця лідараў і "маленькіх людзей" беларускага нацыянальнага руху, іх унутранага свету, разважанняў, эмоцый і стаўлення да іншых асоб.

Фактычна на сённяшні час можна налічыць усяго шэсць дзённікаў прадстаўнікоў беларускіх эліт міжваеннай Польшчы, якія даступны сучасным гісторыкам. "Класічнай" дзённікавай крыніцай, якую выкарыстоўваюць у многіх даследаваннях па гісторыі Заходняй Беларусі, можна назваць "Лісткі календара" Максіма Танка – дзённік пісьменніка 1935–1939 гг., у якім прадстаўлена багатая фактура аб віленскім культурным асяроддзі 1930-х гг. Рукапісы дзённіка Танка не выяўлены, а ў аснове публікацый гэтай крыніцы ляжаць апрацаваныя ў 1960-я гг. уласна пісьменнікам матэрыялы, якія, безумоўна, не былі пазбаўлены ідэалагічных і літаратурных купюр

[38, с. 505]. Перыяд 1930-х гг. як час арганізацыйнага заняпаду беларускага руху і ўзмацнення палітыкі паланізацыі ў Заходняй Беларусі таксама адлюстраваў у сваім дзённіку адзін з лідараў беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў ксёндз А. Станкевіч. Каштоўнасцю гэтай крыніцы з'яўляецца характарыстыка стану беларускай самасвядомасці сярод вясковага насельніцтва Віленскага і Наваградскага ваяводстваў, а таксама фіксацыя антыбеларускай палітыкі мясцовых польскіх чыноўнікаў і інтэлігенцыі [39, с. 837–845]. Перэпетыі праследавання беларускіх актывістаў з боку польскіх улад, акалічнасці іх знаходжання ў польскіх турмах можна прааналізаваць, дзякуючы "турэмным дзённікам" С. Рак-Міхайлоўскага і В. Гадлеўскага, апошні з якіх на сённяшні час не апублікаваны для шырокага чытача і патрабуе грунтоўнага крыніцазнаўчага даследавання [40; 41, с. 76]. Паўсядзённасць беларускага руху ў міжваеннай Польшчы, яе правінцыяльна-лакальны ўзровень, дзейнасць розных нізавых структур беларускіх інстытуцый, арганізацыя культурных мерапрыемстваў і распаўсюджванне беларускай прэсы адлюстраваны ў дзённіках Я. Драздовіча і П. Сеўрука [42; 43, с. 181–213]. Апошні прадстаўляе цікавую крыніцу для вывучэння інтэлектуальных пошукаў беларускіх правінцыяльных эліт ва ўмовах палітычных рознагалоссяў і праследавання з боку польскіх улад у 1920-я гг.

**Высновы.** Такім чынам, эга-дакументы прадстаўляюць велізарны комплекс крыніц, дзе праяўляюцца асаблівасці ўнутранага свету чалавека, яго перажыванняў, эмоцый, канструкцый таго ці іншага жыццёвага выбару, які яму прыходзілася рабіць пад уплывам розных фактараў. На сённяшні дзень выяўлена і верыфікавана адносна нязначная колькасць эга-дакументаў па гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Вялікую ўвагу пры вывучэнні гэтай праблематыцы даследчыкі надаюць эпісталярным крыніцам і ўспамінам, а аўтабіяграфічныя даныя, дзённікі, следчыя матэрыялы па-ранейшаму вывучаны слаба, а многія з іх увогуле не ўведзены ў навуковы ўжытак. Некаторыя эга-дакументы, напрыклад, дзелавая перапіска ці аўтабіяграфічныя анкеты, увогуле застаюцца на перыферыі даследаванняў, бо, на думку гісторыкаў, не ўяўляюць фактаaлагічнага інтарэсу. Тым не менш даследаванні гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Заходняй Беларусі, у якім, безумоўна, галоўную ролю адыгрывалі людзі, маюць значны навуковы патэнцыял з пункта гледжання выкарыстання эга-дакументаў. Стварэнне прасапаграфічных даследаванняў, вывучэнне паўсядзённых практык дзеячаў беларускага руху немагчымы без грунтоўнага аналізу дакументаў, у якіх чалавек спрабуе перадаць нам сваё ўласнае "Я".

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Суржикова, Н. В. Эго-документы: интеллектуальная мода или осознанная необходимость? / Н. В. Суржикова // История в эго-документах: исследования и источники : [сб. ст. и док.] / Ин-т истории и археологии УрО РАН ; редкол.: Н. В. Суржикова (гл. ред.) [и др.]. – Екатеринбург, 2014. – С. 6–13.

2. Ходин, С. Н. История и теория источниковедения : учеб. пособие / С. Н. Ходин, В. П. Грицкевич, С. Б. Каун. – Минск : Изд. центр БГУ, 2008. – 253 с.

3. Dekker, R. Jacques Presser's Heritage: egodocuments in the study of history / R. Dekker // Memoria y Civilización. – 2002. – Vol. 5. – P. 13–37.

4. Greyerz, K. von. Ego-documents: the last word? / K. von Greyerz // German History. – 2010. – Vol. 28, № 3. – P. 273–282. https://doi.org/10.1093/gerhis/ghq064

5. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 368. Ap. 1. B. 60. Перапіска беларускай кнігарні «Пагоня».

6. Гарбачова, В. Мемуарыстыка XIX стагоддзя ў беларускай культурнай традыцыі / В. Гарбачова // ARCHE. – 2014. – № 1–2. – С. 5–14.

7. Пашкевіч, А. В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1930 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Пашкевіч. – Мінск, 2006. – 162 л.

8. Рагуля, В. Успаміны / В. Рагуля. – Мінск : Бацькаўшчына, 1993. – 94 с.

9. Стагановіч, А. Успаміны пасла / А. Стагановіч // Запісы / Беларус. ін-т навукі й мастацтва. – New York, 2009. – Т. 32. – С. 225–330.

10. Сабалеўскі, Ю. Беларуская сялянска-работніцкая грамада / Ю. Сабалеўскі // Запісы / Беларус. ін-т навукі й мастацтва. – New York, 2011. – Т. 34. – С. 325–421.

11. Аляхновіч, Ф. У капцюрох ГПУ / Ф. Аляхновіч. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 238 с.

12. Багдановіч, Я. На жыццёвым шляху : успаміны / Я. Багдановіч. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 144 с.

13. Арсеннева, Н. Выбраныя творы / Н. Арсеннева ; уклад., камент. Л. Савік ; прадм. А. Сямёнавай. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2002. – 589 с.

14. Тумаш, В. Беларуская Віленская гімназія / В. Тумаш // Полацак. – 1992. – № 3. – С. 48–52 ; № 4. – С. 55–57 ; № 5. – С. 49–51 ; № 9. – С. 37–40.

15. Галяк, Л. Успаміны [Электронны рэсурс] / Л. Галяк. – ЗША : Летапіс, 1982. – Кн. 1. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Leanid_Halak/Uspaminy.html. – Дата доступу: 27.01.2020.

16. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы / А. А. Савіч. – Брэст : БрДУ, 2012. – 288 с.

17. Годы испытаний и мужества : сб. воспоминаний / сост.: Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич. – Минск : Беларусь, 1973. – 415 с.

18. Революционный авангард трудящейся молодежи Западной Белоруссии (1921–1939) : док. и материалы / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 327 с.

19. Орехво, Н. С. Дела и люди КПЗБ : воспоминания / Н. С. Орехво. – Минск : Беларусь, 1983. – 287 с.

20. Гурын, М. З недалёкага мінулага / М. Гурын // Беларус. дзень. – 1927. – № 27. – С. 2–5 ; № 28. – С. 3–6 ; № 29. – С. 2–4 ; № 31. – С. 2–4 ; № 33. – С. 2–5.

21. S-nok, J. Paśmiertny ūspamin ab viedamym biełaruskim dziejačy s.p. Fabijanie Jaremiču / J. S-nok // Znič. – 1958. – № 48. – S. 4–5.

22. Bałtupski, A. S. P. Dr. Stanisłau Hrynkievič (pierakładčyk „Sledam za Chrystusam“ Tam. A. Kempis) / A. Bałtupski // Znič. – 1973. – № 117. – S. 7–8.

23. Успаміны аб сьв. пам. інж. Адольфе Клімовічу // Божым шляхам. – 1971. – № 4. – С. 12–13.

24. Ks. Adam Stankievič [успаміны кс. П. Татарыновіча] // Znič. – 1972. – № 114. – S. 2 ; 1973. – № 115. – S. 2–3 ; 1973. – № 116. – S. 5–7.

25. Зарецкий, Ю. Моя жизнь для Государства: массовая практика составления делопроизводственных автобиографий советскими людьми / Ю. Зарецкий // Новое лит. обозрение. – 2019. – № 3 (157). – С. 107–127.

26. LCVA. – F. 175. Ap. 2 (VICa). B. 1530. Асабістая справа студэнта Р. Астроўскага.

27. LCVA. – F. 175. Ap. 2 (VICa). B. 2780. Асабістая справа студэнта К. Крука.

28. LCVA. – F. 175. Ap. 3 (IXCa). B. 498. Асабістая справа студэнта А. Паўлюкевіча.

29. LCVA. – F. 175. Ap. 2 (VICa). B. 154. Асабістая справа студэнта Я. Натусевіча.

30. LCVA. – F. 175. Ap. 2 (VICa). B. 597. Асабістая справа студэнта К. Глінскага.

31. Таўлай, В. Выбраныя творы / В. Таўлай. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 412 с.

32. Тарашкевіч, Б. Аўтабіяграфія / Б. Тарашкевіч // Спадчына. – 1996. – № 4. – С. 96–132 ; № 5. – С. 130–186.

33. LCVA. – F. 1091. Ap. 1. B. 3. Белорусский центр в Литве, анкеты членов Вильнюсской области.

34. Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху / А. Луцкевіч. – Выд. 2-е, дап. і перапраўл. – Вільня [Вільнюс] : Ін-т беларусістыкі ; Беласток : Беларус. гіст. т-ва, 2010. – 332 с.

35. Lietuvos ypatingasis archyvas (LYA). F. K-1. Ap. 58. B. P-12505. Следчая справа Адама Станкевіча.

36. LYA. – F. K-1. Ap. 58. B. 46997/3. Следчая справа Алены Кірылаўны Сакаловай-Лекант.

37. LYA. – F. K-1. Ap. 58. B. 46264/3. Следчая справа Вікенція Антонавіча Грышкевіча.

38. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 9 : Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959). – 2009. – 592 с.

39. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі : зб. тв. / А. Станкевіч. – Вільня [Вільнюс] : Ін-т беларусістыкі, 2008. – 1097 с.

40. Рак-Міхайлоўскі, С. Турэмны дзённік / С. Рак-Міхайлоўскі // Куфэрак Віленшчыны. – 2007. – № 1. – С. 48–97.

41. Вашкевіч, А. Вінцэнт Гадлеўскі: насуперак часу / А. Вашкевіч. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. – 186 с. – (Серыя «Беларускія жыццяпісы» ; вып. 1).

42. Язэп Нарцызавіч Драздовіч. Праз церні да зорак : [успаміны, артыкулы, прысвячэнні, мастацкія творы / уклад. М. Казлоўскага]. – Мінск : Маст. літ., 2014. – 541 с.

43. Сяўрук, П. Небыцця не існуе. Невядомыя старонкі беларускага нацыянальнага руху / П. Сяўрук. – Гародня [Гродна] ; Wrocław : Wrocławska Druk. Nauk. PAN, 2008. – 240 с.

## References

1. Surzhikova N. V. Ego-documents: intellectual fashion or conscious need? *History in ego-documents: research and sources*. Ekaterinburg, 2014, pp. 6–13 (in Russian).

2. Khodin S. N., Gritskevich V. P., Kaun S. B. *History and theory of source studies*. Minsk, Publishing Center of Belarusian State University, 2008. 253 p. (in Russian).

3. Dekker R. Jacques Presser's Heritage: egodocuments in the study of history. *Memoria y Civilización*, 2002, vol. 5, pp. 13–37.

4. Greyerz von K. Ego-documents: the last word? *German History*, 2010, vol. 28, no. 3, pp. 273–282. https://doi.org/10.1093/gerhis/ghq064

*5. Central State Archives of Lithuania (CSAL).* F. 368. Ap. 1. B. 60. Correspondence Belarusian bookstore "Pahonia".

6. Garbachova V. Memoirs of the XIX century in the Belarusian cultural tradition. *ARCHE*, 2014, no. 1–2, pp. 5–14 (in Belarusian).

7. Pashkievich A. V. *Parliamentary forms of struggle for national and social rights of the Belarusian people in interwar Poland (1921–1930).* Ph.D. Thesis. Minsk, 2006. 162 p. (in Belarusian).

8. Ragulya V. *Memoirs*. Minsk, Bats'kaushchyna Publ., 1993. 94 p. (in Belarusian).

9. Staganovich A. Memories of the deputy. *Zapisy Belaruskaga instytutu navuki i mastatstva = Zapisy Belarusian Institute of Arts and Sciences.* New York, 2009, vol. 32, pp. 225–330 (in Belarusian).

10. Sabaleuski Yu. Belarusian Peasants' and Workers' Union. *Zapisy Belaruskaga instytutu navuki i mastatstva = Zapisy Belarusian Institute of Arts and Sciences.* New York, 2011, vol. 34, pp. 325–421 (in Belarusian).

11. Alyakhnovich F. *In the claws of GPU.* Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1994. 238 p. (in Belarusian).

12. Bagdanovich Ya. *On the path of life: memories*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1992. 144 p. (in Belarusian).

13. Arsenneva N. *Featured works*. Minsk, Belaruski knigazbor Publ., 2002. 589 p. (in Belarusian).

14. Tumash V. Belarusian Vilnius Gymnasium. *Polatsak* [Polaca], 1992, no. 3, pp. 48–52; no. 4, pp. 55–57; no. 5, pp. 49–51; no. 9, pp. 37–40 (in Belarusian).

15. Galyak L. *Memoirs. Book 1.* USA, Letapis Publ., 1982. Available at: https://knihi.com/Leanid_Halak/Uspaminy.html (accessed 27.01.2020) (in Belarusian).

16. Savich A. A. *The national liberation movement in Western Belarus (1921–1939): historiography of the problem*. Brest, Brest State University, 2012. 288 p. (in Belarusian).

17. Orekhvo N. S., Stashkevich N. S. (comp.). *Years of trial and courage: a collection of memories*. Minsk, Belarus' Publ., 1973. 415 p. (in Russian).

*18. The revolutionary vanguard of the working youth of Western Belarus (1921–1939): collection of documents*. Minsk, Publishing House of the Belarusian State University, 1978. 327 p. (in Russian).

19. Orekhvo N. S. *KPZB affairs and people: memories*. Minsk, Belarus' Publ., 1983. 287 p. (in Russian).

20. Guryn M. From the recent past. *Belaruski dzen'* [Belarusian day], 1927, no. 27, pp. 2–5; no. 28, pp. 3–6; no. 29, pp. 2–4; no. 31, pp. 2–4; no. 33, pp. 2–5 (in Belarusian).

21. S-nok J. *Paśmiertny ūspamin ab viedamym biełaruskim dziejačy s.p. Fabijanie Jaremiču* [Postmortem memory of well-known Belarusian activists Fabian Jaremich]. *Znič,* 1958, no. 48, pp. 4–5.

22. Bałtupski A. *Dr. Stanisłau Hrynkievič (pierakładčyk „Sledam za Chrystusam" Tam. A. Kempis)* [Dr. Stanislau Hrynkievich (translator "Following Christ" Tam. A. Kempis)]. *Znič,* 1973, no. 117, pp. 7–8.

23. Memories of the engineer Adolf Klimovich. *Bozhym shlyakham* [God's way], 1971, no. 4, pp. 12–13 (in Belarusian).

24. *Ks. Adam Stankievič* [Priest Adam Stankievich]. *Znič,* 1972, no. 114, p. 2; 1973, no. 115, pp. 2–3; 1973, no. 116, pp. 5–7.

25. Zaretskii Yu. My life for the state: the mass practice of composing work record autobiographies for work by soviet people. *Novoe literaturnoe obozrenie* [New Literary Review], 2019, no. 3 (157), pp. 107–127 (in Russian).

26. *CSAL*. F. 175. Ap. 2 (VICa). B. 1530. Student's personal folder, R. Astrouski.

27. *CSAL*. F. 175. Ap. 2 (VICa). B. 2780. Student's personal folder, K. Kruk.

28. *CSAL*. F. 175. Ap. 3 (IXCa). B. 498. Student's personal folder, A. Pavliukievich.

29. *CSAL*. F. 175. Ap. 2 (VICa). B. 154. Student's personal folder, J. Natusievich.

30. *CSAL*. F. 175. Ap. 2 (VICa). B. 597. Student's personal folder, K. Glinski.

31. Taulai V. *Featured works*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2014. 412 p. (in Belarusian).

32. Tarashkevich B. Autobiography. *Spadchyna* [Heritage], 1996, no. 4, pp. 96–132; no. 5, pp. 130–186 (in Belarusian).

33. *CSAL*. F. 1091. Ap. 1. B. 3. Belarusian Center in Lithuania, profiles of members of Vilnius region.

34. Lutskevich A. *To the history of the Belarusian movement*. 2nd ed. Vilnius, Institute of Belarusian Studies, Bialystok, Belarusians Historical Society, 2010. 332 p. (in Belarusian).

35. *Lithuanian Special Archives (LSA).* F. K-1. Ap. 58. B. P-12505. Investigative file, Adam Stankievich.

36. *LSA*. F. K-1. Ap. 58. B. 46997/3. Investigative file, Alena Sakalova-Lekant.

37. *LSA*. F. K-1. Ap. 58. B. 46264/3. Investigative file, Vincent Hryshkievich.

38. Tank M. *Collected works. Vol. 9. Calendar sheets. Diaries (1941–1959).* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2009. 592 p. (in Belarusian).

39. Stankevich A. *With god in Belarus: collected works*. Vilnius, Institute of Belarusian Studies, 2008. 1097 p. (in Belarusian).

40. Rak-Mikhailouski S. Prison diary. *Kuferak Vilenshchyny* [Chest of Vilnius region], 2007, no. 1, pp. 48–97 (in Belarusian).

41. Vashkevich A. *Vincent Hadleuski: in spite of the time*. Minsk, A. M. Yanushkevich Publ., 2018. 186 p. (in Belarusian).

42. Kazlouski M. *Jazep Narcyzavich Drazdovich. Through thorns to the stars: memoirs, articles, dedication, fictions*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 2014. 541 p. (in Belarusian).

43. Syauruk P. *Nothingness does not exist. Unknown pages of the Belarusian national movement.* Grodno, Wrocław, Wrocławska Drukarnia Naukowa PAN, 2008. 240 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Горный Александр Сергеевич** – кандидат исторических наук, доцент. Гродненский государственный университет им. Янки Купалы (ул. Ожешко, 22, 230023, Гродно, Республика Беларусь). E-mail: litvin.gorny@gmail.com

## Information about the author

**Aliaksandr S. Gorny** – Ph. D. (Hist.), Associate Professor. Yanka Kupala State University of Grodno (22 Ozheshko Str., Grodno 230023, Belarus). E-mail: litvin.gorny@gmail.com